*Святлана Кананові*

**РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУХНІ Ў МОТАЛЬСКІМ МУЗЕІ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ**

Фонд музея ў вёсцы Моталь налічвае 27 506 экспанатаў, якія размешчаны ў некалікі залах: выставачным, гісторыі рамёстваў, адзення, абрадаў, ткацтва, дываноў, льнаапрацоўкі. Супрацоўнікі музея адышлі ад традыцыйнай формы экскурсіі, пры якой экскурсавод распавядае пра кожны экспанат, а наведвальнікі проста слухаюць. У Мотальскім музеі народнай творчасці актыўна прымяняюцца інтэрактыўныя элементы: у кожнай зале гучаць песні ў жывым выкананні, усе абрады праходзяць з непасрэдным удзелам наведвальнікаў. Напрыклад, калі праводзіцца спасаўскі цыкл, - выконваецца жніўная праграма, і гледачы маюць магчымасць паслухаць жніўныя песні, пакаштаваць традыцыйныя пірагі з мёдам і яблыкамі.

Такі падыход выклікаў асаблівую цікавасць сярод замежных наведвальнікаў музея. Папулярнасцю ў жыхароў Германіі, Польшчы, Бельгіі, Японіі, Кітая, Намібіі і інш. карыстаецца экскурсія «Народныя абрадавыя стравы». Падчас яе наведвальнікі музея могуць даведацца пра асноўныя палескія святы, а таксама ўбачыць і пакаштаваць тую абрадавую кухню, якая іх суправаджае: гэта і посныя, і святочныя, і штодзённыя стравы, і куцця, і вясельны каравай.

З цягам часу экскурсія відазмянілася. Яна стала больш сучаснай. Асноўны абрад, які дэманструецца гледачам зараз, - падзел вясельнага каравая і апошняя вясельная вячэра. Майстар-клас па гатаванні вясельнага каравая праходзіць у абрадавым доміку пры музеі. Выпечаны і падзелены ў адпаведнасці з мясцовымі традыцыямі (песнямі і карагодамі), вясельны каравай мотальшчыны можа прэтэндаваць на ўключэнне ў спіс культурных каштоўнасцей ЮНЭСКА.

З экскурсіі «Народныя абрадавыя стравы» пачынае сваю гісторыю сусветнавядомы мотальскі кулінарны фэст «Мотальскія прысмакі». Асаблівай адметнасцю якога з'яўляецца тое, што ён не складае ўражанне штучнасці, «стылізацыі». Мотальскія гаспадынькі ды жанчыны з суседніх Опаля, Псышчава, Дружылавічаў, Дастоева, Ляскавічаў, Моладава, іншых сёл прывозяць свае фірменныя стравы. Сталы звычайна падчас фестывалю застаўленыя даволі шчодра. Некаторыя прапаноўваюць паспытаць жур, клёцкі, варэнікі, дранікі, розныя наліўкі. Адметна тое, што гаспадынямі такіх імправізаваных падворкаў з'яўляюцца супрацоўнікі сельскіх клубаў, бібліятэк, музеяў, якія ўсведамляюць значнасць справы захавання, трансляцыі і рэпрэзентацыі традыцый прыгатавання страў. Да прыкладу, экспазіцыя Таццяны Барэйкі з в. Ляскавічы называлася «Бабуліна кухня ад Гаршкалёпаў». З яе дапамогай Таццяна распавядала гасцям фестывалю пра тое, што пэўную частку вёскі Ляскавічы з прадвеку называлі гаршкалёпамі, бо гаршкі ляпілі, былі ганчарамі. І менавіта ў гэтым канцы сяла вясковая кухня адрознівалася сваімі асаблівасцямі.

Падчас фэсту супрацоўнікі Мотальскага музея народнай творчасці рэпрэзентуюць гасцям і ўдзельнікам фестывалю старажытны і «жывы» дагэтуль вясельны абрад. На ім варта спыніцца, на нашу думку, больш падрабязна. Сутнаць і адметнасці вясельнага каравайнага абраду ў вёсцы Моталь, зафіксаванага і рэпрэзентаванага супрацоўнікамі Мотальскага музея народнай творчасці, занатаваны даследчыцай фальклору і аўтарам цыкла «Радавод», журналісткай Р. С. Гамзовіч і прыведзены ніжэй. «...Вяселле, звычайна, гулялі пасля Вадохрышча і пачалі яго зборнай суботай, калі ў хаце жаніха і нявесты збіраюцца сваякі і суседкі пячы каравай. Маладыя ў гэты час не павінны заходзіць у хату. Вось як ладзіўся абрад у хаце жаніха.

Сярод каравайніц розных узростаў была адна маладуха, якая нядаўна ўзяла шлюб, - для пераемнасці традыцый, сакрэтаў выпякання каравая. Нікому з мужчын, акрамя аднаго-двух самых блізкіх сваякоў, не дазвалялася заходзіць у хату. Увесь працэс пячэння каравая суправаджаўся песнямі: «Белая муку сее, харошае расчыняе, а багатае ў печ саджае. / Расці, караваю, вышэй таго гаю, вышэй той печы, / Каб было чатыром легчы каравая сцярэгчы... / А дзе ж тыя кавалі, што жалезныя сякеры? / Хай ідуць печ рубаюць, каравай вымаюць!.. / Ой, ніхто не ўгадае, што ў нашым караваі... / Цэбар вады крынічнай, шанок мукі пшанічнай... »

Пасля расчынення караваю ўсе каравайніцы мыюць рукі ў адной місе, ваду з якой выліваюць пад урадлівую вішаньку. Спяваюць: «Мыйце ручкі, каравайначкі, на вішанькі лійце, / Каб вішанькі радзіліся, нашы дзеці любіліся!» Пакуль цеста падыходзіла, каравайніцы выраблялі «шышкі». Шышка - гэта разгалінаваная галінка пладовага дрэва вышынёй каля 1 метра, якая абвіваецца палоскай цеста і падпякаецца перад полымем, яе ўпрыгожваюць барвенкам, бяссмертнікам, штучнымі кветкамі, жытам, спелым і зялёным аўсом, спяваючы: «Першая каравайніца па падсаддзі хадзіла, цвет капіны ламіла, каравая радзіла. Убірайся, караваю, да зялёнага гаю, то ў мяту, то ў руту, то ў зялёныя кветкі, каб любіліся дзеці! Ой, дайце мне іголку і нітачку шоўку - прышыці кветачку к зялёнаму барвіначку!»

На караваі жаніха было зроблена пяць шышак: дзве трайчаткі - галінкі з трыма адгалінаваннямі, а таксама тры двайчаткі - галінкі з двума адгалінаваннямі (у маладой - дзве двайчаткі і тры трайчаткі). Цікава, што лічба пяць паўтараецца ўсюды ў каравайным абрадзе: пяць каравайніц, пяць шышак, пяць галіначак у суме на шышках, якімі абменьваюцца маладыя падчас вяселля. Шышкі замацоўваюцца на галінках чырвонымі ніткамі - знакам роднасці па крыві. Лічба пяць з'яўляецца ў Моталі родавым знакам, бо на Купалле тут здзяйсняюць традыцыйныя абрады з 5-прамянёвай зоркай. Падчас вяселля маладыя абменьваюцца шышкамі ў знак вернасці (гэты даўні звычай заменены зараз на абмен пярсцёнкамі). Існуе павер'е: чым багацей прыбраныя шышкі, тым шчаслівей будуць жыць маладыя.

Калі цеста выспела, каравайніцы пачалі «круціць каравай» - услед за сонцам, па гадзіннікавай стрэлцы. Затым садзяцца выраблядь разнастайныя фігуркі для ўпрыгожвання верху каравая: птушкі, крыжы, па краі каравая леглі дзве паласы цеста ў выглядзе абруча (у маладой каравай упрыгожвае каса - сімвал дзявоцтва). «Ой, гібніце, гібніце і цвяточкі кладзіце, па краях сыр да масла, у сярэдзіну - долю, шчасце!» - пяецца ў вясельнай песні.

Пасадзіўшы каравай у печ, старэйшая каравайніцы тройчы б'е ў столь драўлянай хлебнай лапатай (знак, звернуты да продкаў). Да каравая, пакуль ён пячэцца, звяртаюцца ў песнях-карацельках: «Расці, караваю, вышэй таго гаю, вышэй тое печы, каб было чатырох легчы каравая сцярэгчы!» і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Каравай лічыцца асабліва ўдалым, калі прыходзіцца разбіваць печ, каб яго дастаць. Тады адна з каравайніц апранае кажух поўсцю ўверх, бярэ сякеру і пачынае сімвалічна сячы печ. Дастаўшы каравай, тры разы стукаюць у столь так, каб хлебная лапата трэснула. Ставяць каравай на века ад дзежкі, на якое спачатку насыпалі жыта, а затым пакрылі надзежнікам. Увесь час працягваюць спяваць песні, у якіх да караваю звярталіся, як да жывой істоты. Калі ён астыў, абцягнулі яго ручнікам, і адначасова ўсе каравайніцы ўтыркнулі ў яго шышкі. Вяроўкай з чырвоных нітак змацавалі 4 і 5 шышкі, пакінуўшы двайчатку (на караваі нявесты пакідаюць трайчатку). Якраз гэтымі незмапаванымі шышкамі маладыя потым абменьваюцца на вяселлі. Паміж шышкамі кладуць невялікую булачку жытняга хлеба, а на ім - кусок сала.

Увесь час песнямі нібыта замаўлялі, малілі Бога даць шчаслівую долю маладым: «Высока сонейка, высока, занясём каравай далёка дай паставіма на аўсы - дай, Божа, як усім! Дай паставіма на сена, дай, Божа, ім шчасліва!» Асабліва ўрачысты момант, калі выносяць каравай у камору. «Мядзведзь барадаты, гаспадар багаты, баіцца прыступіці - каравая выкупіці». Каравай выкупляў брат маладога, затым падымаў яго высока над галавой і тройчы круціўся па хаце «за сонцам», несучы ў камору.

Вяртаючыся з каморы, удзельнікі зборнай суботы выконвалі песню-заклінанне, звернубую да Бога- продка: «Ой, дай, Божа, добры час, як у людзей, так і ў нас! Вясёлая гадзіна, весяліся, радзіна! Весяліся, радзіна, штоб жыта радзіла, штоб і жыта, і авёс, весяліся, род увесь!» Завяршаецца зборная субота застоллем.

Усе прыведзеныя тэксты песень пададзены ў перакладзе з мясцовай гаворкі на сучасную літаратурную мову. Трэба адзначыць, што маталяне карыстаюцца ў штодзённым жыцці толькі сваёй гаворкай. І калі дзяўчына выйшла замуж у Моталь, адкуль бы яна ні была родам, у хуткім часе будзе гаварыць па-мотальску, гатаваць мясцовыя стравы, адзначаць у сям'і традыцыйныя святы і захоўваць звычаі так, як радня мужа і суседкі. Многія навучыліся нават ткаць ад старэйшых маталянак, якія і сёння вырабляюць на продаж хусткі з акрылу, традыцыйныя ручнікі з баваўняных нітак. Захаванню традыцый у вялікай ступені садзейнічае Мотальскі музей народнай творчасці, пры якім існуе фальклорна-этнагарафічны гурт «Мотальскія суседзі», (як і музей, створаны Вольгай Мацукевіч). Поўнаму захаванню традыцыйнага вяселля садзейнічае тое, што ў XIX ст. яго апісала ўраджэнка суседней вёскі Моладава Марыя Саковіч.

Акрамя абраду ў музеі рэпрэзентацыя традыцыйнай кухні моталян адбываецца пры непасрэдным саўдзеле мотальскага фальклонага тэатра «Мотальскія суседзі».

Тры замалёўкі з калядных свят, увасобленыя ў самабытную праграму «Святочныя вечары», такія знаёмыя людзям старэйшага пакалення, знітаваны адной галоўнай думкай: паказаць шчырасць, працавітасць, гумар палешукоў і захаваць усё гэта назаўсёды, перадаючы з пакалення ў пакаленне.

Першы сюжэт «Калядная куцця» знаёміць наведвальнікаў музея не толькі са звычаямі і абрадамі, але і смачнай, і багатай палескай кухняй - стравамі, якія павінны быць абавязковымі ў кожнай хаце напярэдадні Каляд.

На занятках з дзецьмі ўдзельнікі гурта тлумачаць, што з прыходам свята пачынаюцца віншаванні адзін аднога пасля прыходу з царквы, каледаванне, а да вечара - заручыны. І, нарэшце, заключньм момантам зімовых свят становіцца хрышчэнская варажба і іншыя звычаі, звязаныя са святочнай вячэрай. А яшчэ - абавязковы абрад «Сівая кабылка», дзе ў цэнтры ўвагі аказваюцца дзяўчаты, якія пакуль што не выйшлі замуж.

За паўтары гадзіны, на працягу якіх адбываецца дзеянне то ў сялянскай хаце, то на вуліцы, то пераносіцца ў двор, наведвальнікі музея не толькі адпачываюць, але і пазнаюць мноства таямніц, якія захоўвае вусная народная творчасць. Галоўнае ў тым, што сцэнічнае дзейства да таго зямное і роднае, што гледачы зліваюцца разам з акцёрамі - а гэта найвышэйшая прыкмета аўтэнтычнасці фальклору.

Прыемна, што рэпертуар народных артыстаў пасля вядомых спектакляў «З усмешкай і ўсур'ёз», «Масленічныя забавы», «Каб не гэтая прызба», «Маленькія бурштынкі вялікага палескага фальклору» папоўніўся яшчэ адным, з такім жа цудоўным выкананнем кожнай ролі - «Святыя вечары». На працягу 20 год дырэктарам, рэжысёрам і акцёрам з'яўляецца дырэктар Мотальскага музея народнай творчасці Вольга Рыгораўна Мацукевіч. Яна ўмела прыцягвае сваіх артыстаў да работы ў залах музея. Толькі ў гэтым годзе тэатрам у музеі было дадзена да 20 спектакляў. Апрача таго, артысты народнага тэатра ўдзельнічаюць у музейных экскурсіях, у розных праграмах: «Жывы гук»; круглагадовай абраднасці, звязанай з сельскагаспадарчым календаром; у музычна-педагагічных занятках «Як кашуля ў полі вырасла», «Казкі бабулі Алены», «Духоўны свет аднаго чалавека» і інш.

Такім чынам, рэпрэзентацыя аднаго з элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны - традыцыйнай кухні - у Мотальскім музеі народнай творчасці адбываецца як пры непасрэдным удзеле носьбітаў традыцыі, так і па сродках музейнага мадэлявання культурнай прасторы вёскі Моталь, якая дагэтуль зберагла «жывую» традыцыю выпякання вясельнага караваю і прыгатавання традыцыйных страў Мотальшчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ